**Урок беларускай літаратуры ў 6 класе. К.Чорны "Насцечка"**

**Аксана Іосіфаўна Ванчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі №1 Дзятлава

**Аповесць «Насцечка» знаходзіцца па-за часам і сёння не страціла сваёй актуальнасці ў мэтах фарміравання маральна-этычных каштоўнасцей. У творы, наскрозь прасякнутым выхаваўчымі матывамі, паказана, як сямейнае выхаванне аказвае ўплыў на фарміраванне і станаўленне характару. На ўроку дзеці вучацца характарызаваць герояў і выказваць свой погляд на іх паводзіны і ўчынкі. Педагог стварае ўмовы для развіцця мыслення і звязнага маўлення, выхавання ў навучэнцаў чуласці, добразычлівасці, пачуццяў сяброўства і калектывізму.**

**Урок беларускай літаратуры ў 6 класе. К.Чорны "Насцечка"**
**Тэма: "Характарыстыка Сержа праз канкрэтныя ўчынкі"**

**Задачы:**

- ✓ паглыбіць веды вучняў  пра разгорнутую характарыстыку героя;
- ✓ развіваць ўменне вызначаць паводзіны і ўчынкі;
- ✓ заўважаць у тэксце аўтарскую характарыстыку праз мастацкія дэталі, апісанні;
- ✓ садзейнічаць развіццю ўменняў вучняў аналізаваць, параўноўваць, выказваць і аргументаваць уласную думку;
- ✓ спрыяць выхаванню добразычлівасці, павагі да старэйшага пакалення.

**Эпіграфы да ўрока:**

*Кожны чалавек – гэта цэлы свет* (К.Чорны).

*Кожны чалавек ад прыроды – чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня* (К.Чорны).

*Быць чалавекам – цяжкае прызванне, не ўсім, не кожнаму ўтрымаць яго* (Т. Бондар.)

**Ход урока**

**I. Матывацыйна-арганізацыйны этап**



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Настаўнік вітае вучняў і пачынае сустрэчу з верша Пімена Панчанкі “Той дзень прапаў і страчаны навекі...” (чытае верш на памяць).*

– Да каго звяртаецца аўтар у вершы? *(Да чалавека.)*

– Што павінен рабіць чалавек кожны дзень, каб дзень не быў страчаным?

*(Дапамагаць людзям, не абысці чужую бяду, не быць абыякавым да абразы, быць уважлівым да тых, хто знаходзіцца побач.)*

– Ключавое слова верша і нашага ўрока – ЧАЛАВЕК.

– Якія асацыяцыі, што адпавядаюць учынкам і характару чалавека, узнікаюць у вас, калі вы чуеце слова “чалавек”?

*На дошцы размешчаны словы, якія дапамогуць даць адказ на пытанне.* (Увага, дабрыня, дапамога, хуліганства, эгаізм, нахабнасць, узаемападтрымка, клопат пра блізкіх, стараннасць, злосць, адказнасць, павага да бацькоў, смеласць, ганарлівасць, упартасць, фанабэрыстасць, схільнасць да маніпуляцыі, подласць, зазнайства, помслівасць, задзірыстасць, зайздрасць.)

*Вучні выбіраюць 5 назоўнікаў і аргументуюць.*

– Вельмі прыемна, што словы, якія вы выбралі, характарызуюць станоўчыя рысы характару любога чалавека. Спадзяюся, што яны вам належаць.

**II. Пазнавальна-аперацыйны этап**

– А зараз звернемся да дошкі, дзе размешчаны кросенс да нашага ўрока. Уважліва паглядзіце на малюнкі.

– Каго з герояў твора вы бачыце?

– Чаму менавіта з гэтага партрэта пачынаецца заданне?

– Хто з герояў аповесці схаваны ў цэнтры?

– Каго вы бачыце на 3 малюнку? *(Вучні могуць назваць Мішку ці Сержа.)*

*Неабходна звярнуць увагу дзяцей на настрой хлопчыка, выгляд, адзначыць такія якасці, як няўпэўненасць, нерашучасць, баязлівасць. Пасля гэтага сумесна робіцца выснова, што хлопчык на малюнку не можа быць Сержам, які ў творы валодае зусім іншымі рысамі характару. Вучні называюць герояў і тлумачаць, які эпізод аповесці адлюстраваны.*



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА



1



2



3



8

?

9



4



7



6



5



1



2



3



8



9



4



7



6



5



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

–У цэнтры кросенса – вобраз Сержа. Як вы думаеце, чаму? *(Вучні даюць адказы.)*

–Тэма нашага ўрока " Характарыстыка Сержа праз канкрэтныя ўчынкі".

– Мы з вамі паспрабуем вызначыць мэты ўрока пры дапамозе дзеясловаў ДАВЕДАЦЦА… ПРААНАЛІЗАВАЦЬ… АБАГУЛІЦЬ…

–Для таго, каб даць поўную характарыстыку Сержу і разабрацца ў яго ўчынках, прапаную вам звярнуцца да памяткі

**ПЛАН ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЛІТАРАТУРНАГА ГЕРОЯ**

1. **Агульныя звесткі:**
- Назва твора, у якім дзейнічае герой, імя аўтара.
- Кароткае апісанне ролі героя ў творы (галоўны, другарадны, эпізадычны).

2. **Знешнасць:**
- Апісанне фізічных рыс героя (рост, постаць, твар, валасы, вочы і г.д.).
- Наяўнасць адметных рыс, дэталяў вопраткі.
- Важнасць знешнасці для характару і паводзін героя.

3. **Паводзіны:**
- Апісанне ўчынкаў героя ў розных сітуацыях.
- Рысы характару, якія выяўляюцца праз паводзіны (смеласць, баязлівасць, сумленнасць, хітрасць, і г.д.).
- Рысы паводзінаў, якія характэрныя для героя (імпульсіўнасць, разважлівасць, упэўненасць, няўпэўненасць і г.д.).
- Тыповыя для героя паводзіны ў розных сітуацыях (дома, у школе, у кампаніі).

**4. Унутраны свет:**
- Эмоцыі, якія герой адчувае (радасць, смутак, гнеў, страх, і г.д.).
- Матывы, якія рухаюць героя (каханне, помста, жаданне багацця і г.д.).
- Перажыванні героя, ягоныя думкі і сумненні.
- Самаацэнка героя, ягонае разуменне сябе і сваёй ролі ў свеце.

**5.** Адносіны з іншымі героямі:
- Апісанне адносін героя з іншымі персанажамі (сяброўства, каханне, варожасць, павага, грэбаванне і г.д.).
- Роля іншых герояў у фарміраванні характару і паводзінаў дадзенага героя.

**6. Роля ў творы:**
- Асноўная роля героя ў сюжэце твора (станоўчы, адмоўны, канфліктны).
- Роля героя ў раскрыцці галоўнай тэмы твора.
- Сімвалічнае значэнне героя.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**7.** Мастацкае значэнне:

- Ацэнка таленту аўтара ў стварэнні характару героя.
- Сучаснае гучанне героя, ягоная актуальнасць для сучаснага чытача.
- Высновы пра асобу героя і ягонае месца ў свеце.

– Звернемся да аднаго з галоўных герояў – Сержа. Паглядзім, як і чаму менавіта так герой паводзіць сябе з аднакласнікамі, са сваімі бацькамі, са старэйшымі людзьмі.

– Працаваць будзеце па радах. Вам неабходна запоўніць табліцу, пацвердзіць складнікі характарыстыкі радкамі з аповесці і напісаць хэштэг у апошняй калонцы. Нагадаю, што хэштэг – гэта запазычанае слова, якое выкарыстоўваецца для абазначэння (#) знакам рашоткі ў сацыяльных сетках і мікраблогах ключавога слова або фразы. Ён дапамагае абагульніць паведамленне, перадаючы яго адным ці некалькімі словамі. Для напісання хэштэга можна выкарыстоўваць словы-асацыяцыі, размешчаныя на дошцы.

| Характарыстыка | Інфармацыя, радкі з твора | Хэштэг<br>(рыса характару) |
|---|---|---|
| | 1 рад | |
| Агульныя звесткі; знешнасць героя | | # |
| Паводзіны; унутраны свет | | # |
| | 2 рад | |
| Узаемаадносіны з аднакласнікамі, сябрамі, бацькамі | | # |
| Роля ў творы і мастацкае значэнне | | # |
| | 3 рад | |
| Адносіны аўтара да героя | | # |
| Выснова | | # |

**Аналіз выкананых заданняў**

Калі адзін з вучняў адказвае, астатнія дапісваюць звесткі ў табліцу. Такім чынам у канцы працы над гэтым заданнем у кожнага вучня атрымаецца поўная характарыстыка галоўнага героя.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Выснова.** Ад гэтага хлопчыка нельга чакаць нічога добрага. Яго цешаць пакуты дзяўчат. Ён зневажае дарослых: пажылога чалавека называе “дурнем і старым чортам”. Прачытаўшы аповесць, мы можам зрабіць выснову, што хлопчык –“поўны злосці”, нахабны і адначасова труслівы і подлы (хоча адпомсціць старому, падглядае за ім).

**Фізкультхвілінка**

**Практыкаванні для вачэй**

1. Лёгкі масаж вачэй пальцамі ад пераносся да краёў. (5 разоў.)
2. Моцна заплюшчыць, потым расплюшчыць вочы. (5 разоў.)
3. Узяць аловак і максімальна наблізіць да вачэй, канцэнтруючы на ім позірк. Аддаліць прадмет і перанесці позірк удалячынь. (5 разоў.)
4. Пры нерухомым твары правесці позіркам па ўсёй траекторыі, якая нагадвае гарызантальную васьмёрку спачатку ў адным напрамку, потым у другім.

**Праца над зместам твора. Аналітычная гутарка**

– Якая, на вашу думку, прычына разбэшчаных паводзін Сержа?
– Як вы лічыце, ці змог Серж пасля таго, як даведаўся пра гісторыю сваіх бацькоў і Закрэўскага памяняць свае адносіны да людзей?
– Ці можам мы з вамі сказаць, што Серж не ва ўсім адмоўны персанаж? Ці ёсць у яго добрыя рысы характару.

– Давайце зараз успомнім, што адбывалася дома ў Закрэўскіх, калі прыехала матуля Насці?

*****Індывідуальнае заданне**

Для найбольш поўнай характарыстыкі галоўнага героя неабходна запоўніць яго асабістую старонку УКантакце, карыстаючыся ўрыўкамі з твора, фотаздымкамі. Мэтай прыёму з’яўляецца развіццё аналітычных уменняў рабіць высновы з тэкставага паведамлення, выяўляць матывы ўчынкаў герояў, аўтарскую пазіцыю. Вучням прапаноўваецца:

— размясціць адзін фотаздымак на старонцы героя;
— назваць сяброў Сержа, іх колькасць;
— агучыць каментарыі на старонцы Сержа.

**III. Завяршаючы этап. Рэфлексія**

– Якія станоўчыя якасці чалавека, вы хацелі б, каб былі ў вас? (Звярнуцца да слоў-асацыяцый, размешчаных на дошцы.)
– А ці можа чалавек пазбавіцца ад іншых якасцей, якія вы не назвалі, але яны, на жаль, прысутнічаюць?
– Як вы лічыце, станоўчыя ці адмоўныя якасці характару пераважаюць у Сержа?

– Ці змяніўся, на вашу думку, Серж у канцы аповесці ў адносінах да іншых герояў аповесці?

**Зварот да эпіграфаў**


ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

–Якое выказванне, на вашу думку, можна аднесці да нашага героя?

– Ці спадабаўся вам урок?

– Да якой высновы, прааналізаваўшы вобраз, вы прыйшлі?

**Зварот да мэтаў ўрока**

Настаўнік прапаноўвае вучням самастойна вызначыць дасягнутыя мэты ўрока.

**Выстаўленне і каменціраванне адзнак**

**Дамашняе заданне:**

Напісаць міні-сачыненне на адну з прапанаваных тэм, выкарыстаўшы звесткі з табліцы (“Якім мне бачыцца Серж праз 5 гадоў”, .“Ці хацеў бы я сябраваць з Сержам?”).

**Літаратура**

1. Бельскі А. І., Навумчык М. І., Цітова Л. К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 6 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2022.

2. Чорны К. Збор твораў: у 6 т. Т. 4. Раман, аповесці, п’еса, публіцыстыка, 1930– 1940. Мінск : Маст. літ., 1989.

3. Панчанка П. І вера, і вернасць, і вечнасць: вершы. Мінск : Маст. літ., 1986.



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА